# Копіі не горш за арыгінал

**Нацыянальная бібліятэка прэзентавала факсімільнае выданне Тураўскага Евангелля. Як растлумачыў дырэктар установы Раман Матульскі, яно выраблена з захаваннем усіх асаблівасцей арыгінала і ў суправаджэнні гістарычных і кнігазнаўчых каментарыяў. Тыраж — пяцьсот экзэмпляраў, гэта стала магчымым дзякуючы апякунскаму савету бібліятэкі і, у прыватнасці, кампаніі «Xerox».**

**Копіі гэтага ўнікальнага помніка славянскай пісьменнасці плануецца перадаць беларускім і замежным установам навукі, культуры і адукацыі. Некалькі лепшых школ краіны атрымалі іх у якасці падарунка да 1 верасня.**

**Тураўскае Евангелле — самы старажытны кніжны помнік Беларусі і адзін з самых старажытных ва Усходняй Еўропе. Быў створаны яшчэ ў XI стагоддзі і знойдзены ў 1865 годзе ў Тураве ў скрыні з-пад вугалю. Да нашых дзён дайшоў дзесяцістаронкавымі фрагментамі. Арыгінал беларускай святыні захоўваецца ў бібліятэцы Акадэміі навук Літвы ў Вільнюсе. Па значнасці Тураўскае Евангелле не ўступае Слуцкаму Евангеллю і Крыжу прападобнай Еўфрасінні Полацкай.**